# РОЛЯ РЭГІЯНАЛЬНАГА КАМПАНЕНТУ Ў ФАРМІРАВАННІ ПАТРЫЯТЫЧНЫХ ПАЧУЦЦЯЎ У ДЗЯЦЕЙ ДАШКОЛЬНАГА ЎЗРОСТУ

***Кавальчук Кацярына Мікалаеўна,***
*загадчык дзяржаўнай установы адукацыі*
*"Дварэцкі яслі-сад" Дзятлаўскага раёна*

Як вядома, гарманічнае развіццё дзіцяці немагчыма без фарміравання ў яго самасвядомасці, самапавагі, нацыянальнай годнасці. Патрыятычыя этнапедагагічныя традыцыі, на падставе якіх выхоўваюцца любоў да роднай мовы, роднага краю, да сваёй сям'і, з'яўляюцца моцнымі сродкамі ўздзеяння на маленькага чалавека. Разуменне гэтага вызначыла адным з прыярытэтных напрамкаў дзейнасці нашай установы фарміраванне патрыятычных пачуццяў выхаванцаў на падставе выкарыстання рэгіянальнага кампаненту ў адукацыйным працэсе.

Праз арганізацыю розных форм работы з кадрамі разгледзелі хвалюючыя нас пытанні выхавання дзяцей у дадзеным накірунку (правялі анкетаванне, вывучылі запыты, спланавалі мерапрыемствы: лекцыя-дыялог "Тэарэтычныя асновы патрыятычнага выхавання дзяцей дашкольнага ўзросту ва ўмовах рэгіянальнага кампаненту","Этапы, формы і метады патрыятычнага выхавання"(круглы стол), гульня-віктарына "Гісторыя, традыцыі і культура беларускага народа".

Звярнулі ўвагу на ўдасканаленне моўнай кампетэнтнасці спецыялістаў дашкольнай адукацыі. З гэтай нагоды сталі актыўна праводзіць моўныя трэнінгі "Скажы па-беларуску", "Наша прыгожая беларуская мова".

Сталі актыўнымі ўдзельнікамі паседжанняў раённых метадычных аб'яднанняў. Так, у выязным семінары па тэме "Прадметна-прасторавае асяроддзе як эфектыўны сродак арганізацыі адукацыйнага працэсу на беларускай мове" прыняла ўдзел загадчык Кавальчук К.М. У рабоце метадычнага аб'яднання выхавальнікаў першай і вышэйшай кваліфікацыйнай катэгорыі па тэме "Далучэнне дзяцей дашкольнага ўзросту да нацыянальнай культуры, беларускай мовы сродкамі праектнай дзейнасці" прынялі ўдзел выхавальнікі першай кваліфікацыйнай катэгорыі Нашуцінская С.К. і Сідорчык Н.І. У рабоце метадычнага фарміравання музычных кіраўнікоў устаноў дашкольнай адукацыі па тэме "Далучэнне дзяцей дашкольнага ўзросту да беларускай культуры праз народныя святы і абрады» прыняла ўдзел музычны кіраўнік першай кваліфікацыйнай катэгорыі Рудоль В.Р.

Як вынік – педагагічныя работнікі сістэматызавалі веды аб гістарычным мінулым дзяржавы, малой радзімы, традыцыях і культуры, геаграфічным становішчы і прыродным акружэнні, удасканалілі навыкі беларускага маўлення. Таксама ўсвядомілі, што выхаванне любві і павагі да сваёй Радзімы, да роднай мовы неабходна ажыццяўляць на падставе прынцыпу "ад малога да вялікага" – ад выказвання эмацыянальнай прыхільнасці, добрых адносін да сваіх блізкіх, бліжэйшага асяроддзя, да сваёй малой радзімы.

Каб забяспечыць якасць адукацыйнага працэсу ў дадзеным накірунку прадугледзелі падыходы да ўдасканалення развіваючага прадметна-прасторавага асяроддзя.

З гэтай нагоды змянілі падыходы да афармлення сцэнавой прасторы памяшканняў агульнага карыстання (актавай залы, хола другога паверха, лесвічнага марша) і гульнявых пляцовак. Асноўная ідэя ўнясення змен у іх афармленне

заключаецца ў тым, што ўся прастора цяпер належыць дзецям, а выявы адлюстраваных аб’ектаў (царква, касцел, ільнозавод, жытневае і ільняное поле, поры года і г.д.) не толькі зразумелыя дзецям, але і выклікаюць у іх эмацыянальны водгук і цікавасць. Неабходна адзначыць, што актыўны ўдзел у афармленні прымалі і дзеці: мастак маляваў контур прадмета, а дзеці ў вольны час яго размалёўвалі. Каб створанае прадметна-прасторавае асяроддзе не было застылым, а стала развіваючым не толькі на словах, асобныя элементы дэкора сцен дапаўняем прадуктамі творчай дзейнасці дзяцей: малюнкамі, калажамі і г.д.

У ценявых навесах размясцілі грыфельныя дошкі, што дае магчымасць дзецям намаляваць убачанае, стварыць індывідуальныя і калектыўныя малюнкі.

У групавым памяшканні і на ценявым навесе рознаўроставай групы (ад 4 да 7 гадоў) размясцілі стэнд-карты “Падарожжа па Беларусі” і “Падарожжа па аг.Дварэц”, выкарыстанне якіх дазваляе развіваць слоўнікавы запас, уменне складаць аповеды, праводзіць экскурсіі.

Ценявы навес рознаўроставай групы (ад 2 да 4 гадоў) аздобілі выявамі сюжэтаў казак, што дае магчымасць развіваць творчасць і ініцыятыву дзяцей, звязнае і маналагічнае маўленне ў нерэгламентаваных відах дзейнасці.

Унеслі элементы рэгіянальнага кампаненту ў арганізацыю сюжэтна-ролевых гульняў “Пошта”, у нас яна мае назву “Белпошта”, “Атэлье”, у нас – атэлье “Лянок”, так як на тэрыторыі аграгарадка маецца прадпрыемства “Дварэцкі ільнозавод”, магазін мае назву “Родны кут ”. Створаны ўмовы для арганізацыі сюжэтна-ролевай гульні “Чыгуначная дарога”, якая дарэчы на самой справе праходзіць праз Дварэц. Для арганізацыі сюжэтна-ролевай гульні “Кафэ “Бульбашык” афармілі меню “Беларускія стравы”, у склад якіх уваходзяць стравы, прыгатаваныя з бульбы, напрыклад, “Дранка па-дварэцкі”, “Бабуліны клёцкі” і г.д. Праз гульню выхаванцы адлюстроўваюць быт беларусаў, вучацца беражліва адносіцца да культурна-гістарычных каштоўнасцей рэгіена і краіны ў цэлым.

Распрацаваныя намі дыдактычныя гульні “Беларускі сувенір”, “Славутыя мясціны Беларусі”, “Складзі карту Беларусі”, “Мінулае і сучаснае аг. Дварэц”, “Знаўцы роднага краю”, “Прафесіі ў сельскай гаспадарцы”, “Назаві па- беларуску”, “Едзе з поля ўраджай”, “Фальклорная скарбонка” і г.д. дазваляюць замацаваць уяўленні аб краіне, роднай вёсцы.

Для больш дасканалага азнаямлення з побытам беларускага народа, яго традыцыямі ладзім зменныя міні-выставы, напрыклад “Сялянская хата”, “Міні-музей ільну”. Створаны інтэр’ер, прадметы побыту мінулых гадоў дапамагаюць дзецям зразумець іх культурнае значэнне і рукатворнасць, становяцца нязменным памочнікам у вывучэнні культуры свайго народа. Адметнай асаблівасцю зменных выстаў з’яўляейцца тое, што экспанаты (вышываныя ручнікі, дываны, плеценыя з лазы гаспадарчыя рэчы) прадстаўлены народным ўмельцамі дварэцкага краю.

У асобным пакоі стварылі пазнавальна-гульнёвы модуль “Чытальная зала”, у якім у адпаведнасці з тэматыкай пэўнага тыдня ладзяцца кніжныя выставы, у тым ліку прысвечаныя творчасці пісьменнікаў-юбіляраў, выставы дзіцячых малюнкаў. Чытаем вершы, апавяданні, якія дапамагаюць пазнаёміць дзяцей з прыгажосцю роднай зямлі – палёў, лясоў, азёр, рэк. Любяць сюды прыходзіць дзеці і таму, што тут “жывуць казкі ў чамадане”. Дапаможнік “Казка ў чамадане” змяшчае зменныя дэкарацыі (ложак з

падузорнікам, печ, стол, палавік) і лялькі да розных казак. Дзеці, гуляючы з героямі казак, могуць уносіць любыя варыяцыі ў знаёмыя ім казачныя сюжэты. У дзяцей ёсць магчымасць складаць мноства гульнёвых сітуацый, а таксама разыгрываць тэатральныя пастаноўкі. Дарэчы, ідэя стварэння дапаможніка "Казка ў чамадане" з'явілася тады, калі выхаванцы былі запрошаны на літаратурную сустрэчу з былымі выпускнікамі садка, першакласнікамі Дварэцкай сярэдняй школы, і па ўмовах сустрэчы павінны былі паказаць казку.

Важнай часткай нашай работы з'яўляецца ўзаемадзеянне з бацькамі, бо менавіта з адносін таты і мамы да роднай мовы і роднага краю ў дзіцяці фарміруюцца першыя ўражанні і першая любоў да таго месца, дзе ён нарадзіўся. Перавагу аддаем актыўным формам работы, якія аб'ядноўваюць усіх удзельнікаў адукацыйнага працэсу. Да прыкладу, у "Кошык літаратурных прысмакаў" прапануем прынесці прыказку альбо прымаўку па тэме тыдня, якую знайшлі разам з бацькамі, у "Блакноце народных прыкмет" дарослым неабходна зрабіць запіс прыкметы, а дзецям – адлюстраваць праз малюнак выявы і г.д. Вельмі цікава і з актыўным удзелам бацькоў праходзяць забавы і агляды-конкурсы: "Восеньскі букет", "Навагодняя паштоўка", "Рэцэпт беларускай стравы", "Зробім цацку" і інш.

Эфектыўнай формай работы з бацькамі ў дадзеным накірунку лічым і правядзенне сустрэч у сямейнай гасцёўні (тэмы сустрэч "Традыцыі нашай сям'і", "Скарбы народнай мудрасці" і г.д.).

У межах года малой радзімы педагагічнымі работнікамі нашай установы з выхаванцамі сярэдняга і старэйшага дашкольнага ўросту рэалізаваны адукацыйны праект "Дварэц – мая любая вёска". Дзеці здзяйснялі віртуальныя і рэальныя падарожжы па сцежках малой радзімы, пазнаючы яе прыгажосць і непаўторнасць. Азнаямленне са старонкамі гісторыі адбывалася ў выглядзе спецыяльна створаных гульнёвых сітуацый: "Што карта можа расказаць", "Раскажы госцю аб гісторыі і сучаснасці Дварца". Пазнаёміліся дзеці і з творчасцю мясцовага мастака Сокала Аркадзя Мяфодзьевіча, у мінулым настаўніка Дварэцкай сярэдняй школы, які выступіў, дарэчы, у ролі спонсара і аздобіў сценавую прастору ўстановы. Азнаямленне са старонкамі гісторыі ў выглядзе гутарак, дыдактычных гульняў дазволіла паказаць адметнасць беларускай зямлі, побыт яе жыхароў мінулых стагоддзяў, растлумачыць, адкуль пайшлі беларусы. Вынікам рэалізацыі праекта стала арганізацыя турыстычнага агенцтва "Сцежкамі роднага краю". Прадметна-развіваючае асяроддзе папоўнілася дыдактычнымі лялькамі "Прафесіі нашых бацькоў".

Вялікую ролю надаем падрыхтоўцы і правядзенню каляндарных свят і абрадаў (Новы год, Мамін дзень, Калядкі, Вялікдзень), якія з'яўляюцца арганічнай часткай народнай культуры. Іх святкаванне не толькі ўзбагачае і актывізуе слоўнік дзяцей, але і ўзбагачае дзяцей веданнем народных традыцый, узмацняе сувязь пакаленняў.

Акрамя каляндарных святаў мы заўседы праводзім "Кірмаш", "Вячоркі", на якіх дзеці знаёмяцца з побытам беларускага народа, яго майстэрствам, рамёствамі. У восеньскіх кірмашах асноўнае месца займаюць агародніна і садавіна. Адначасова праводзім выставу вырабаў з садавіны і гародніны, сухіх лістоў і кветак. На зімовых кірмашах выстаўляюцца вырабы з тканіны, прыроднага матэрыялу і з цеста, вышыўка, дзіцячыя работы па выніках правядзення заняткаў.

Да ўдзелу ў святах абавязкова запрашаем бацькоў. Бацькі ўносяць прапановы ў сцэнарый свята, аказваюць дапамогу ў падрыхтоўцы касцюмаў, афармленне залы, афішы, прымаюць удзел у правядзенні мерапрыемства. З іх дапамогай напярэдадні свята зала заўседы прыбіраецца: вывешваюцца саматканыя посцілкі, ручнікі і вышыўкі, засцілаюцца абрусы, выстаўляюцца вырабы народна-прыкладнога мастацтва.

У нас трывалыя ўзаемаадносіны: дзіцячы сад-школа-сям'я. З цікавасцю наведваем школьны гісторыка-краязнаўчы музей. Тут дзеці знаёмяцца з прадметамі побыту, адзеннем, вырабамі з саломы, ільну, гліны, музычнымі прыладамі, з традыцыямі беларускага народа. Старэйшыя выхаванцы часта самі паспяхова выконваюць ролю экскурсавода, шмат пра што ведаюць і могуць цікава расказаць. Вынікам такіх заняткаў становяцца дзіцячыя малюнкі, вырабы з гліны, пластыліну, паперы.

Праведзеная работа забяспечыла ўзмацненне цікавасці выхаванцаў і бацькоў да нацыянальных традыцый, культуры і мовы, стварыла ўмовы для плённага супрацоўніцтва.

Дзейнасць па развіцці і выхаванні ў дзяцей патрыятычных пачуццяў сродкамі рэгіянальнага кампаненту дае станоўчыя вынікі: у выхаванцаў з'явілася ўстойлівая цікавасць да народнай культуры і да гісторыі народа, пачуццё гонару за сваю Бацькаўшчыну, паважлівае стаўленне да карэнных жыхароў краю, дзе яны нарадзіліся.

Такім чынам, прывіваючы дзецям любоў да малой радзімы, мы імкнемся выхаваць з іх маленькіх патрыётаў. Мы ўпэўнены, што нашы выхаванцы будуць любіць свой край, пусцяць тут свае карані і сваёй працай праславяць нашу малую радзіму.

Выдатны савецкі педагог Васіль Аляксандравіч Сухамлінскі казаў "Клапатлівы садоўнік умацоўвае корань, ад моцы якога залежыць жыццё расліны на працягу некалькі дзесяцігоддзяў". Так і педагогі павінны клапаціцца аб выхаванні ў сваіх дзяцей пачуцця бязмежнай любві да сваёй Радзімы. Усё ў нашых руках.